Што адбывалася далей? Актывы банкаў пераўтвараліся ў пазыкі, аўтаматычна пагаршаліся паказчыкі фінансавай устойлівасці банкаў… А потым адбывалася рэкапіталізацыя банкаў — Нацбанк за свой рахунак папаўняў актывы гэтых банкаў. Фокус у тым, што Нацбанк з такім жа поспехам мог «намаляваць» грошы на рахунках датуемых прадпрыемстваў без удзелу банкаў-пасярэднікаў. Дык вось, для «казённага» сектара эканомікі ў Беларусі заўжды была звыш мяккая грашова-крэдытная палітыка, а для астатняй часткі — гэтая палітыка была звыш жорсткай, каб хоць нешта кампесаваць.

Беларуская эканамічная мадэль не апісваецца ні ў адным падручніку. Ну дзе яшчэ такое можна ўбачыць, каб эканамічнай палітыкай прадпрыемства была «не дай Бог не паказаць прыбытак», бо тады ж не атрымаеш ні датацый ні субсідый ад дзяржавы…

Беларуская эканоміка многія гады працавала, як адна вялікая фірма пад назвай Беларусь, дзе маглі быць і планава ўбытачныя аддзелы, каб цэнтр прыбытку знаходзіўся ў іншым месцы. Дарэчы, калі сюды прыязджалі спецыялісты сусветнага банка і задавалі пытанне: «А які памер гэтых субсідый?» ім ніхто дакладна адказаць не мог.

У гэтай сітуацыі цяжка сказаць, хто ўбытачны, а хто прыбыльны. У некага ільготы па прыбылі, у кагосьці ільготы на дабаўленую вартасць. Фактычна, эканамічныя ўлады Беларусі самі выбіралі, хто будзе ўбытачны, а хто прыбыльны…

У апошнія гады мадэль эканамічнага роста ў асноўным больш чым напалову забяспечвалася прыростам крэдытавання ў межах дзяржпраграм. Прыкладна з 2006 года мадэль эканамічнага роста грунтавалася на знешнім фінансаванні. І якасць гэтых інвестыцый, пачынаючы з 2006 года, паслядоўна пагаршалася. У гэтым сэнсе 2006 год быў апошнім устойлівым годам, з якога і пачалося назапашванне дысбалансаў.

Доля будаўніцтва ў структуры інвестыцый паслядоўна нарастае. Яно праходзіць па раздзеле «Інавацыі ў асноўны капітал», але насамрэч гэта проста будаўніцтва. За кошт інвестыцый у жыллёвае будаўніцтва, прычым у асноўным ільготнага, нам удалося зрабіць узровень Валавага унутранага прадукта станоўчым па выніках 2009 года. Пры гэтым доля сапраўдных інвестыцый — у машыны і абсталяванне — паслядоўна зніжаецца, і зараз складае прыкладна 38%. Гэта гістарычны мінімум за ўсю гісторыю суверэннай беларускай эканомікі…

Пра тое, што Нацбанк Беларусі — фактычны банкрот

Фактычна можна гаварыць, што недзе з красавіка 2011 Нацыянальны банк Беларусі — тэхнічны банкрот. Яго абавязацельствы перавышаюць яго ж актывы. І пры гэтым прыдуманы «чароўны» інструмент для таго, каб «маляваць» наяўнасць золатавалютных рэзерваў. Гэта свопы з камерцыйнымі банкамі.

*Беларуская эканамічная мадэль не апісваецца ні ў адным падручніку. Ну дзе яшчэ такое можна ўбачыць, каб эканамічнай палітыкай прадпрыемства была "не дай Бог не паказаць прыбытак", бо тады ж не атрымаеш ні датацый ні субсідый ад дзяржавы…*

Што такое свопы? Камерцыйныя банкі прыцягваюць валюту. Нацбанк яе ў іх адбірае, залічвае сабе на тры — шэсць месяцаў, а ім дае беларускія рублі, маўляў, працуйце, бо крэдыты ў валюце ў нас забаронены. І фокус заключаецца ў тым, што гэтыя абавязацельствы трэба выконваць, а грошы аддаваць. І ў Нацбанка не толькі нэта- актывы сталі адмоўнымі, але і памер абавязацельстваў перад камерцыйнымі банкамі перавысіў у структуры залатавалютных рэзерваў, рэсурсы самога Нацбанка ў замежнай валюце.

Калі гаварыць пра вострую фазу крызіса, якую Беларусь перажывае зараз, то нельга не адзначыць і ролю ў гэтым Нацбанка. За апошнія тры-чатыры месяцы насельніцтва купіла 1,5 мільярда долараў. У студзені камерцыйныя банкі звярнуліся ў Нацбанк з просьбай аднавіць свой валютны баланс, а там ім адказалі: «Не ўсе адразу».

Улютым Нацбанк сваёй пастановай унёс абмежаванне для пакупкі камерцыйнымі банкамі валюты, якая рэалізоўвалася насельніцтву. Камерцыйныя банкі маглі купіць валюту на міжбанкаўскай біржы толькі ў першыя тры дні месяца і толькі ў памеры фактычнага продажу ў папярэднім месяцы. Студзень і люты былі спакойнымі, а ў сакавіку выйшла справаздача МВФ, дзе было напісана, што Беларусі не пазбегнуць дэвальвацыі.

Людзі адрэагавалі хутка — яны кінуліся ў абменнікі. А там што? А там было вельмі мала валюты. І калі яна фізічна скончылася, стала зразумела: «Грошай няма». А Нацбанк замест таго, каб адмяніць сваю ж пастанову, цэлы тыдзень рабіў добрую міну пры дрэннай гульні, маўляў, усё нармальна. Нацбанк нічога не рабіў тыдзень. Калі стала зразумела, што паніка не заканчваецца, валюту сталі падвозіць па прынцыпу «дзень у дзень», у залежнасці ад таго, колькі было прададзена ўчора.

Цярплівасці Нацбанка хапіла на тыдзень. Бо за гэты тыдзень людзі скупілі 760 мільёнаў долараў і Нацбанк 22 сакавіка вырашыў прыпыніць продаж валюты насельніцтву. На той момант золатавалютныя рэзервы Нацбанка складалі 1 мільярд 800 мільёнаў, а за тыдзень раскупалася 760 мільёнаў, Нацбанку стала страшна… У такім «паралізованым» рэжыме наш валютны рынак і функцыянiруе…

Пра незавершаную дэвальвацыю

«Нармальнае выйсці з такога дысбаланса — гэта дэвальвацыя. Праз якую, напрыклад, у свой час прайшлі Польшча і Украіна. У нас жа атрымалася па-свойму: слова «дэвальвацыя» вымаўляць было нельга, праблему спрабавалі вырашыць «вынаходніцтвам» адміністрацыйных мыліц — з'явілася мноства курсаў.

Афіцыйны — 3000, наяўны, — 4–4500, курс на «чорным рынку» — 6–7 і курс на Міжбанкаўскай біржы — за 10 тысяч. Два тыдні таму курс быў парабалічны. Аднак у рэшце рэшт курс рубля на Міжбанкаўскай біржы стаў умацоўвацца, таму што імпарцёры адмовіліся прывозіць сюды тавар з-за тых коштаў, якія б ім прыйшлося выставіць на тавары. Ім жа не толькі курс трэба ўлічваць, але і прыбытак. Імпарцёрам стала зразумела, што ніхто ў Беларусі па завоблачных коштах іх прадукцыю набываць не будзе… І тады курс пачаў падаць, рубель стаў умацоўвацца. Гэта нармальна. І ўжо на мінулым тыдні курс бы стабілізаваўся на міжбанкаўскай біржы ў межах — 5600–6000 рублёў. Аднак у гэты самы момант Нацбанк кажа: «4930». Што перашкаджала паставіць 6000? Здзелкі на Міжбанкаўскай біржы праходзілі па курсу прыблізна 6000 рублёў.

І што ў выніку — валюты зноў няма. І зараз мы апынуліся ў куды горшай сітуацыі, чым пасля самой дэвальвацыі… Фокус у тым, што мы сабралі ўвесь негатыў, які суправаджае інфляцыю, а эканамічнай выгады не атрымалі…

Дарэчы, на фоне дэвальвацыі ў Беларусі ізноў сталі цыркуліраваць чуткі аб увядзенні расійскага рубля. Я лічу, што ніякіх перспектыў яго ўвядзення няма. Гэта не трэба ні нам, ні Расіі, бо гэта не вырашыць нашых паблем.

Што зараз трэба зрабіць? Правесці аб'ектыўныя таргі на міжбанкаўскай біржы, куды б прыходзілі заяўкі і ад камерцыйных банкаў і ад імпарцёраў. І вось пасля гэтага ўсталяваўся б аб'ектыўны, роўнаўзважаны курс беларускага рубля, які трэба было б прызнаць. Зразумела, што ўпалі б нашы заробкі, яны і так фактычна ўпалі, але гэта заробкі, якія стварае наша эканоміка. Нашы заробкі — гэта ўзровень канкурэнтаздольнасці нашай эканомікі. Але калі мы робім выгляд, што канкурэнтаздольнасць эканомікі вышэй і штучна завышаем курс рубля, то вынікам стане таварны дэфіцыт і рост цэн… Таму плануемае з 1 чэрвеня падвышэнне пенсій на сённяшні дзень нічым эканамічна неабгрунтавана.

# ХТО ЛІДАР?

## Бухвостаў: Сярод працоўных павінны з'явіцца новыя лідары

**Адзін з лідараў незалежных прафсаюзаў Аляксандр Бухвостаў і палітык Віктар Івашкевіч параўналі сітуацыю на заводах сёння і 20 гадоў таму.**

**Еўрарадыё**



Масавы мітынг працоўных на плошчы Леніна 10 красавіка 1991 года..

Пасля дэвальвацыі рубля, у доларавым эквіваленце заробкі істотна паменшыліся. Таму Еўрарадыё даведалася пра сітуацыю на заводах і прадпрыемствах ад аднаго з лідараў беларускага незалежнага прафсаюзнага руху Аляксандра Бухвостава. Ён разам з сябрам аднаго са страйкавых камітэтаў 1991 года Віктарам Івашкевічам правёў паралелі паміж сённяшнімі падзеямі і падзеямі таго часу.

**Еўрарадыё: Якая зараз сітуацыя на беларускіх прадпрыемствах? Прайшлі чуткі, што сітуацыя на "Трактарным заводзе" вельмі складаная, ці вам пра гэта вядома?**

Бухвостаў: "Так, учора была інфармацыя пра тое, што на «Трактарным заводзе» ўзніклі хваляванні ў цэхах, і крыніцы пацвердзілі, што гэта сапраўды ёсць. Я не бачу тут незвычайнасці, бо абвал, які адбыўся ў эканоміцы, балюча ўдарыў па працоўных і, натуральна, працоўныя будуць выказваць прэтэнзіі. Іншая справа, ці гэта будуць масавыя пратэсты, якія «выльюцца» вонкі, на Плошчу, ці гэта будуць лакальныя пратэсты, якіяз зможа падавіць адміністрацыя прадпрыемства. Тут пакуль гэта невядома".

**Еўрарадыё: Вашы прагнозы – ці стрымае адміністрацыя хваляванні?**

Бухвостаў: «Гэта як "дыханне 1991 года", калі працоўныя выйшлі на вуліцу пасля абвалу, які адбыўся з цэнамі ў той год. Гэта было даўно, і працоўныя, якія ўдзельнічалі ў тых дэманстрацыях, яны пастарэлі, але я думаю, што яны добра гэта памятаюць. З іншага боку, той адміністрацыйны рэсурс, які зараз уздзейнічае на працоўных, натуральна, гэта не параўнаць з тым, што было ў 1991 годзе. Усё залежыць ад таго, ці здолее працоўны пераадоліць страх і пратэст будзе значна мацнейшы, чым ціск адміністрацыі. Таму на заводах павінны ўзнікнуць новыя лідары, новыя арганізуючыя пачаткі, якія змогуць падняць працоўных супраць гэтага беззаконня»

**Еўрарадыё: На піўным заводзе "Рэчыца" пратэсты скончыліся пасля таго, як працоўнікам выплацілі абяцаныя прэміі. Ці людзі чакаюць разавых урэгуляванняў, каб іх супакоіць. Ці настрой больш ваяўнічы?**

Бухвостаў: «Тое, што адбылося зараз, разавымі прэміямі ўжо не супакоіш. Калі, напрыклад, на "Трактарным заводзе" заробак быў 700 доляраў, а стаў 350 ці 300, як яго аднавіць да такога ўзроўню? А асабліва, калі людзі ўзялі крэдыты, валютныя крэдыты – яны трапляюць у кабалу. Тут пытанне перавядзецца ў палітычную плоскасць. Калі працоўныя зразумеюць, што гэта адбылося па віне кіраўніцтва краіны, а не кіраўніка прадпрыемства, то гэта павінна перайсці ў палітычныя хваляванні. Я разлічваю, што беларускія працоўныя скажуць сваё слова ў барацьбе за дэмакратыю і за змяненні ў Беларусі».

**Еўрарадыё: Тыя рэшткі незалежных прафсаюзаў, якія засталіся, яны гатовыя да такіх падзеяў?**

Бухвостаў: «Складана казаць. Справа ў тым, што цягам працяглага часу Лукашэнка змог загнаць незалежныя прафсаюзы фактычна ў падполле. Ёсць моцныя прафсаюзы на "Белкаліі", яны павінны сказаць сваё моцнае слова ў пратэстах. На іншых заводах у нас невялікія арганізацыі. Я думаю, нашы людзі стануць арганізуючым пачаткам. Але сілаў у незалежных прафсаюзаў зараз няма і мы разлічваем на тое, што з'явіцца новыя лідары, з'явіцца запатрабаванасць у арганізацыі незалежных арганізацый працоўных»

Былы рэдактар газэты "Рабочы", сябра аднаго са страйкавых камітэтаў Віктар Івашкевіч.

**Еўрарадыё: Правядзіце, калі ласка, паралелі паміж тымі падзеямі 1991 года і сённяшнімі.**

Івашкевіч: "Тое, што ідзе сацыяльная напруга, тое, што ідзе рэзкае збядненне – гэта вельмі падобна на тое, што было ў канцы 1990-га пачатку 1991 года. Розніца, праўда, толькі ў тым, што тады, падчас перабудовы, было больш свабоды дзеянняў апазіцыйным групам – гучала ў прамым эфіры сесія Вярхоўнага Савета, дзе дэпутаты БНФ, апазіцыя, мелі магчымасць выступаць і шмат людзей маглі гэта чуць. А з іншага боку, зараз ёсць інтэрнэт – і ён, нейкім чынам, інфармацыйна кампенсуе.

Тая інфармацыя, якая прайшла пра страйк на "Рэчыцкім" піўным заводзе, гэта з той жа сферы, што было ў канцы 1990-га. Думаю, што да кастрычніка, калі пратэсты прымуць масавы і агульнарэспубліканскі характар, будуць нарастаць лакальныя абурэнні на асобных прадпрыемствах". ⬢

*В. Некляев: [19 декабря] На площади должны были создать БНР – Беларускі народны рух «За выбары без Лукашэнка», а также принять резолюцию с требованием новых выборов, поскольку эти не являются справедливыми.*

## Хто выведзе людзей на вуліцы?

**Гэты артыкул мяне папрасіў напісаць Віталь Сіліцкі. Цела ягонае скаванае цяжкай хваробай, а сэрца ўсцяж баліць за Беларусь.**

**Мікола Бугай, Наша Ніва, NN.by**

Ідэалогія аўтарытарнага росту ляжыць у развалінах.

А гэта ж быў аснаватворны міф рэжыму Лукашэнкі.

Яшчэ ніколі рэжым не быў такі слабы, як сёння, — перасвараны з Усходам і Захадам, абцяжараны 30-мільярдавым замежным доўгам.

Пасля двухмесячнага маўчання ўлада вуснамі кіраўніка шматслоўна агучыла адзін рэцэпт для выхаду з крызісу — андропаўскую дысцыпліну ўзору 1984 года. Гэта выглядае так: кароль голы, але працягвае махаць шабляй.

З другога боку, сацыялогія паказвала, што напярэдадні крызісу мы мелі рэкордныя праеўрапейскія і прарынкавыя настроі. Мы маем вялікую масу думаючых грамадзянаў, зацікаўленых у змене ўлады на падсправаздачную грамадзянам і перамене правілаў гульні ў эканоміцы.

Народ адчувае сябе падманутым — і ён не памыляецца. Народ адчувае сябе абрабаваным — якое адкрыццё.

У краіне нарастаюць пратэставыя настроі.

*Палітолаг Віталь Сіліцкі: У краіне, дзе няма парламента, няма апазіцыі без вуліцы.*

Абарона студэнта-безбілетніка ад міліцыі, графіці, інтэрнэт, — толькі кветачкі. Стыхійныя выступы могуць перарасці ў арганізаваны, стваральны рух.

Грамадства гатова абараняць свае правы і інтарэсы. Але дзе апазіцыя?

Дзе тая апазіцыя, што так чакала «рэвалюцыйнай сітуацыі»? Не бачым яе, яна прыпыніла дзейнасць.

Да тых, хто ў турмах, — Аўтуховіч, Саннікаў, Севярынец, — пытання няма. Але тыя, што на свабодзе, маюць перад сабой выклік. Калі яны ўзялі на сябе лідарства, яны абавязаны арганізоўваць грамадства на абарону сваіх інтарэсаў.

Дзе кіраўнікі шумных кампаній? Дзе старшыні партый, якія былі на другіх ролях, і дзе тыя, хто аспрэчваў у іх лідарства? Цяпер Ваш час. Дзе тыя кандыдаты, якім не хапала рэсурсаў на прэзідэнцкую кампанію? 1000 улётак — і нацыя вас будуць слухаць.

Дзе, нацыянальныя платформы грамадзянскай супольнасці?

У краіне, дзе няма парламента, няма апазіцыі без вуліцы.

Канструктыўная апазіцыя абавязана выводзіць людзей на вуліцу ў крызісныя моманты.

Калі яна бяздзейнічае, яна робіцца дэструктыўнай для грамадства. ⬢



**19 снежня 2010**

# СЛЕДЧЫ: СПРАВЫ АНАРХІСТАЎ І ТЭРАКТА Ў МЕТРО СФАБРЫКАВАЦЬ НЕСКЛАДАНА

Еўрарадыё
Вольга Міцкевіч

Былы следчы з Жодзіна, Андрэй Пыжык, які ўцёк за мяжу, выказвае занепакоенасць якасцю следства ў краіне, якое, паводле ягоных словаў, дазваляе звінаваціць любога ў чым заўгодна.

**Еўрарадыё: На мінулым тыдні прайшлі суды над анархістамі. На судах анархісты казалі пра тое, што на іх ціснулі. Хто аказвае гэты ціск і прымушае даваць такія паказанні?**

Пыжык: «Што тычыцца ціску, то ў праваахоўных органаў гэтая справа паўсядзённая. На жаль, у гэтым нічога дзіўнага няма. Ціснуць у першую чаргу аператыўныя супрацоўнікі, якія такім чынам падымаюць раскрывальнасць злачынстваў. Усё гэта робіцца або на замову, або з мэтай проста раскрыць злачынства, праявіць сябе для дадатковага заробку, звання».

**Еўрарадыё: А каго могуць замовіць, любога грамадзяніна? Чым трэба займацца, кааб на цябе пачалі фабрыкаваць справу?**

Пыжык: «У першую чаргу гэта тычыцца апазіцыі. Гэта могуць быць і нейкія эканамічныя злачынствы».

**Еўрарадыё: Ці можа следчы, пракурор, суддзя адмовіцца выконваць такую замову?**

Пыжык: «Тэарытычна, канешне, можа. Выбар застаецца за ім, але гэта можна зрабіць на першапачатковай стадыі. Пасля ён будзе заменены на асобу, якая ўжо не адмовіцца. Але ціснуць з усіх бакоў, асабліва на асобаў, якія ўжо былі «запэцканыя».

**Еўрарадыё: На вашую думку, як праводзілася справа анархістаў? І як праводзіцца следства тэракту ў Мінскім метро?**

Пыжык: «Справу пра анархістаў мне складана пракаментаваць, бо я валодаю толькі той інфармацыяй, кая з'яўлялася ў Інтэрнэце. Што тычыцца тэракта, гэта не толькі маё меркаванне, але і супрацоўнікаў праваахоўных органаў, з якімі я маю кантакт, ён быў сплянаваны вузкім колам супрацоўнікам спецслужбаў. Каманда была дадзеная зверху. Улада ведала, што і як планавалася. Гэта было вельмі выгодна ўладзе».

**А ці ёсць нейкія факты, якія могуць пра гэта сведчыць? На што б вы звярнулі ўвагу?**

Пыжык: «У любых забойствах заўжды ёсць канкрэтны матыў. У дадзеным выпадку гэта тычыцца масавага забойства людзей — гэтага матыву няма. Ніхто не можа патлумачыць, навошта яны гэта зрабілі і чаму. Таксама здзіўляе час прыбыццё на месца прэзідэнта. Усе звярнулі ўвагу, што прыехаў ён вельмі хутка. Там нават выбухатэхнікі, эксперты не паспелі да канца правесці агляд месца здарэння, гэта дакладна. А ён быў упэўнены, што няма другой выбуховай прылады. Другая, трэцяя бомба магла выбухнуць, а ён заходзіць з дзіцёнкам як да сябе дамоў. Яны маглі нават нешта падкінуць або ненаўмысна знішчыць. Вельмі шмат дзіўных нюансаў. Бо як па СМІ паведамлялася, хлапец сам прызнаўся.

Калі чалавек прызнаецца, то ён паказвае усё ад А да Я — усё, як і навошта. Яму не трэба дыктаваць, ён усё распавёў на допыце. Таму павінны спакойна ўсе распавесці на месцы. Там таксама было заяўлена, што для вывучэння псіхікі тэрарыста ўключаны спецыялісты Інстытута нацыянальнай бяспекі, выбачаюся, але псіхіку злачынцы вывучаюць не чэкісты нашыя, а лекары-псіхіатры. І пасля ён адразу прызнаўся ва ўсіх іншых выбухах. Пытанне – ён меркаваў, што яго за гэта пахваляць. Яго расстраляюць. Супрацоўнікі спецслужбаў паведамілі, што выкарыстоўвалася дыперакіс ацэтона, у народзе яе называюць «кіска». У Інтэрнэце сапраўды ёсць інфармацыя, як яе зрабіць і для гэтага не трэба быць цуда-хімікам, але каб яе прыгатаваць, патрэбныя веды, месца нармальнае. Трэба быць спецыялістам па зборцы выбуховых рэчываў. Пры яго вырабе нельга выкарыстоўваць нават газетную паперу, бо ў газетнай паперы знаходзіцца свінец, а ён можа выклікаць дэтанацыю. Нават удары па гэтым выбуховым рэчыве могуць выклікаць дэтанацыю. А на камерах паказана, як ён ідзе з гэтай сумкай, размахвае, змяняе рукі, перакідвае сумку з рукі на руку. Нібыта не ведае, што там бомба. І хуткасць раскрыцця злачынства здзіўляе. Гадамі расследуюць адзін выбух, другі. А тут загад Прэзідэнта, 24 гадзіны — і асабліва цяжкае злачынства раскрытае. Зварʼяцець можна».




Былы следчы з Жодзіна, Андрэй Пыжык




# СТАРЕЙШИЙ ПРАВОЗАЩИТНЫЙ ЦЕНТР БЕЛАРУСИ ОТМЕТИЛ 15-ЛЕТИЕ

Салідарнасць
http://gazetaby.com/

«Несмотря на тяжелые времена, правозащитники будут работать в любых условиях», – заявил руководитель правозащитного центра «Весна» Алесь Беляцкий.

– Праздник у нас не особо радостный. И белорусское общество, и наша организация переживают драматические времена, – отметил на встрече с журналистами руководитель центра Алесь Беляцкий. – В то время, когда проходят суды над участниками митинга 19 декабря 2010 года, праздновать не время.

Правозащитник отметил, что ни разу оппозиция и общество не испытывали такого прессинга со стороны властей, как за прошедшие после выборов пять месяцев.

– Однако, не будем забывать, что «Весна» появилась в не менее драматический для Беларуси период. Весна 1996 года была очень тяжелой. Именно она ознаменовала открытое противостояние граждан и исполнительной власти. Первое уголовное дело против активистов оппозиции было возбуждено именно против участников акции 14 марта, посвященной Дню Конституции. Тогда начались первые задержания, – вспомнил Алесь Беляцкий год создания организации. – 26 апреля 1996 года власть впервые попыталась разогнать массовую акцию – «Чернобыльский шлях». Арест более 200 участников шествия был шоком для всех.

– Несмотря на тяжелые времена, правозащитники будут работать в любых условиях. За 15 лет работы наша организация оказала помощь десяткам тысяч человек, – отметил Алесь Беляцкий. – Правозащитники и журналисты находятся на первой линии сопротивления антидемократическим режимам, которые цинично попирают права человека. В государстве происходит полномасштабный кризис, но как показывает практика, именно в кризисные моменты решалась судьба страны.

Накануне 15-летия организации правозащитники подготовили экспертную оценку криминальных процессов над участниками акции простеста 19 декабря.

– События 19 декабря носили характер мирной акции протеста. Ее участники имели мирные цели, кандидаты в президенты во время своих публичных выступлений призывали людей на мирную акцию. Да, некоторые демонстранты совершили противоправные действия, но оценивать их как массовые беспорядки нельзя. Следствие проходило с грубейшими нарушениями. Не было реализовано право на защиту, презумпция невиновности. К подозреваемым применялись пытки, – отметил заместитель руководителя организации Валентин Стефанович. – Всех осужденных по этим делам мы считаем политическими узниками.

К 15-летию сотрудники центра подготовили обзор-хронику нарушений прав человека в Беларуси в 2010 году.

– Насколько эффективно нам удается наша деятельность судить трудно, но, судя по реакции на нас официальных СМИ и государственной пропаганды, мы видим, что наши действия власть задевают, и она вынуждена на нас реагировать, – резюмировал Алесь Беляцкий.

Справка «Салідарнасці»: В 1998 году правозащитный центр «Весна» был зарегистрирован как Минская городская организация, а уже в 1999-м – как республиканское правозащитное общественное объединение. В октябре 2003 года центр был ликвидирован решением Верховного суда. Причиной стало участие членов организации в наблюдении за президентскими выборами 2001 года. 6 марта 2004 года центр «Весна» был принят в Международную федерацию прав человека. Комитет по правам человека ООН 24 июня 2007 года признал, что ликвидировав «Весну», белорусские власти нарушили пункт 1 статьи 22 Международного пакта о гражданских и политических правах. Официальный Минск это решение ООН проигнорировал.



**Беларускі журналіст Еўрарадыё, Андрэй Елісееў у Вашынгтоне. Андрэй – сябра нашага горада, перыядычна робіць сюжэты пра Смалявічы і дзейнасць нашай ініцыятывы.**

## Сын амбасадара Венесуэлы кінуў БДУ і паехаў вучыцца ў ЕГУ

19-гадовы Каміла пражыў у Беларусі тры гады. Спачатку збіраўся вучыцца ў БДУ. Але праз пару месяцаў пасля паступлення кінуў. Сышоўшы з прэстыжнай спецыяльнасці “Міжнародныя адносіны”, Каміла пачаў рыхтавацца да паступлення ў Еўрапейскі гуманітарны універсітэт. Цяпер Каміла Дыас навучаецца на першым курсе “Медыя і камунікацыяў” ЕГУ (http://ehu.lt). Еўрарадыё здзівілася і паспрабавала даведацца — чаму?

*“Прыехаў у Вільню. Паглядзеў універсітэт і вырашыў паступаць. Мне цікава. Многія скардзяцца, ёсць свае недахопы, але ў цэлым падабаецца. Якасць адукацыі задавальняе. Большасць выкладчыкаў добрага ўзроўня”.*

Паводле Каміла, выкладчыкі ў БДУ таксама высокага ўзроўню. Але вялікая колькасць студэнтаў не можа шчыльна кантактаваць з выкладчыкамі, што кепска.

*“Выкладчыкі, ў асноўным, добрыя, але было шмат нудных лекцый. Мне не спадабалася. Да таго ж былі дрэнныя ўмовы. Будынак быў вельмі стары. Узімку халодна, улетку горача. Мне болей падабаецца ў Вільні”.*

На думку Камілы, у плане адпачынку Вільня не нашмат адрозніваецца ад Мінску. Хіба што літоўская сталіца больш прывабная для аматараў начных клубаў, у якія Каміла ходзіць не вельмі часта.

Тым не менш, у Вільні хлопец адчувае сябе больш камфортна. Можа, і таму, што ён паспеў знайсці там дзяўчыну — таксама студэнтку ЕГУ.

Бацька Камілы Амерыко Дыас Нуньес, амбасадар Венесуэлы ў Беларусі, жаданне сына вучыцца ў Вільні успрыняў з разуменнем.

*“Ён не тое, што абрадаваўся. Але зразумеў, што я ўжо дарослы і магу сам вырашаць. Раней я вандраваў па Еўропе, таму бацькі за мяне не баяліся”.*

Тое, што бацька Камілы амбасадар, хлопец не афішуе. Кажа, што гэта жыццё яго бацькоў.

**Еўрарадыё**

I love SM

жадаеш атрымаць такую футболку?

Smaliavichy.by

Інфарматыўны бюлетэнь горада Смалявічы “Горад Наш“, тыраж: 299 ас.
Галоўны рэдактар: Яўген Смалявіцкі,
Мастацкі рэдактар: Зорачка
E-mail: goradnasz@gmail.com
Распаўсюджваецца бясплатна.
Складальнік: Грамадская ініцыятыва “За Новыя Смалявічы“